ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1982
6
МАЯ
ЧАЦВЕР
№ 17 (1355)
Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з мая 1922 года

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

"Беларускі універсітэт"
## тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

### ВЯЛІКУЮ ЦІКАВАСЦЬ

у выкладчыкаў і студэнтаў механіка-матэматычнага факультэта выклікаў адкрыты агляд кніг па матэматыцы, арганізаваны абанементам вучэбнай літаратуры. Дэкан факультэта М. С. Гарашчук, загадчык кафедры тэорыі функцый Э. І. Звяровіч, загадчык кафедры тапалогіі і матэматычнай логікі А. С. Фядэнка, старшы выкладчык кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў Р. Л. Прохарава і іншыя супрацоўнікі факультэта, якія наведалі выстаўку, далі карысныя рэкамендацыі па выкарыстанню прадстаўленай літаратуры ў вучэбным працэсе.

**І. ВАЛАСЕВІЧ,**
**бібліятэкар.**

### ДНЮ ДРУКУ

прысвячаецца традыцыйны агляд-конкурс выпускаў «Камсамольскага пражэктара», у якім штаб «КП» БДУ запрашае прыняць удзел усе падраздзяленні універсітэта.

**А. ШЫБУТ,**
**начальнік штаба «КП».**

### ЗБОРНАЯ КАМАНДА

фізфака па радыёспорту і кулявой стральбе заняла другое месца на спаборніцтвах ДТСААФ. А Уладзімір Дубінец і Вольга Піменава сталі чэмпіёнамі універсітэта.

**І. ЗЫБАЙЛА.**
**(Прэс-цэнтр прафкома)**

### ЛАЎРЭАТАМ

VI Інтэрнацыянальнага студэнцкага фестывалю палітычнай песні ў Маскве стаў квартэт студэнтак юрыдычнага факультэта нашага універсітэта. А на фестывалі «Палітычная песня-82», які праходзіў у Ерэване, Гран-пры атрымаў студэнт філфака Уладзімір Васіленка.

**Э. АНІСЕНКА,**
**мастацкі кіраўнік студэнцкага клуба.**

### УСПАМІНАМІ

аб Вялікай Айчыннай вайне падзеляцца са студэнтамі фізічнага факультэта выкладчыкі — ветэраны вайны — на вечары, прысвечаным Дню Перамогі, які рыхтуецца зараз на факультэце.

**Г. РЫГОРАЎ.**

● ДА 60-ГОДДЗЯ ЎТВАРЭННЯ СССР

## Навукова-практычная канферэнцыя

НА ФАКУЛЬТЭЦЕ павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў адбылася навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 60-годдзю ўтварэння СССР. Яна мела сваёй мэтай не толькі асвятленне пытанняў утварэння і станаўлення першага ў свеце аб'яднання раўнапраўных рэспублік нашай краіны, але і змяшчала ў сабе метадычныя рэкамендацыі па вывучэнню і прапагандзе пастановы ЦК КПСС «Аб 60-й гадавіне ўтварэння СССР».

Уступным словам работу канферэнцыі адкрыў дэкан факультэта дацэнт І. Т. Рагоўскі, які адзначыў яе важнасць і актуальнасць.

У дакладзе слухачкі Н. Д. Тупіковай «У адзінай сям'і брацкіх народаў» былі раскрыты асноўныя этапы ўтварэння СССР, на канкрэтных прыкладах было паказана, як пад кіраўніцтвам КПСС наша краіна, праводзячы ленінскую нацыянальную палітыку, стала першай у свеце дзяржавай раўнапраўных і свабодных народаў.

Аб поспехах і дасягненнях Беларусі ў брацкай сям'і народаў Савецкага Саюза расказаў слухач В. С. Мазур. З цікавымі паведамленнямі аб эканамічным і сацыяльным росквіце Латвіі і Малдавіі выступілі слухачы А. І. Палжэ, Э. І. Марару.

У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел выкладчыкі ФПК.

**А. АЛТАЙЦАЎ,**
**слухач ФПК.**



## З Днём Перамогі, таварышы!

9 МАЯ — СВЯТА ПЕРАМОГІ САВЕЦКАГА НАРОДА Ў ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЕ. АД ШЧЫРАГА СЭРЦА ВІНШУЕМ ВЕТЭРАНАЎ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ З ДНЁМ ПЕРАМОГІ. 1418 ДНЕЙ І НАЧЭЙ НАБЛІЖАЛІ ЯНЫ ГЭТАЕ СВЯТА. 1418... МНОГІЯ З ТЫХ, ШТО ПАЙШЛІ АД СЦЕН РОДНАГА УНІВЕРСІТЭТА НА СВЯШЧЭННУЮ БІТВУ З ФАШЫЗМАМ, НЕ ВЯРНУЛІСЯ Ў АЎДЫТОРЫІ. ПАМЯЦЬ АБ ІХ НАЗАЎСЁДЫ Ў СЭРЦАХ СЯБРОЎ І НАШЧАДКАЎ.

ВЕТЭРАНЫ ВАЙНЫ І ЦЯПЕР У СТРАІ. ЯНЫ ПЕРАДАЮЦЬ СВАЕ ВЕДЫ І БАГАТЫ ВОПЫТ МОЛАДЗІ УНІВЕРСІТЭТА. АБ НЕКАТОРЫХ З ІХ РАСКАЗВАЕЦЦА НА 3-й СТАРОНЦЫ ГАЗЕТЫ.

РАШЭННІ XXVI З'ЕЗДА КПСС — У ЖЫЦЦЁ!

# ВЕРНЫЯ СПРАВЕ БАЦЬКОЎ





Нядаўна прайшоў сход камсамольскага актыву універсітэта, на якім абмеркавана пытанне «Аб ходзе выканання камсамольскай арганізацыяй Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна мерапрыемстваў па ажыццяўленню рашэнняў XXVI з'ез-

(Заканчэнне на 2-й стар.).

# Верныя справе бацькоў

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

да КПСС і ўзмацненню выхаваўчай работы з моладдзю».

На сходзе прысутнічалі кіраўнікі універсітэта, дэканы, намеснікі дэканаў факультэтаў, загадчыкі кафедр, сакратары партыйных арганізацый, камсамольскі актыў. З дакладам выступіў дэлегат XIX з'езда ВЛКСМ, сакратар камітэта камсамола універсітэта Аляксандр Рухля. У спрэчках па дакладу выступілі член камітэта камсамола універсітэта, член бюро ЦК ЛКСМБ, студэнтка хімфака Святлана Канаш, камсорг групы юрфака Ірына Дрозд, старшыня штаба універсітэцкага «КП» Аляксандр Шыбут, студэнт факультэта радыёфізікі і электронікі Уладзімір Гафановіч, намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта па ідэалагічнай рабоце Ала Нежавец, камандзір педагагічнага атрада філфака Тамара Сямко, начальнік штаба працоўных спраў універсітэта Алег Чулкоў.

З цікавай і змястоўнай прамовай аб поспехах камсамольцаў універсітэта і далейшых задачах камсамольскай арганізацыі выступіў рэктар, акадэмік АН БССР У. А. Белы.

Прапаноўваем увазе чытачоў вытрымкі з даклада А. Рухлі і пастанову сходу камсамольскага актыву.

Год назад, 5 мая 1981 года, мы збіраліся ў гэтай жа зале і прымалі мерапрыемствы камсамольскай арганізацыі БДУ імя У. І. Леніна па выкананню рашэнняў XXVI з'езда КПСС і ўзмацненню выхаваўчай работы з моладдзю. Прайшоўшы год нашы камсамольцы, як і ўвесь савецкі народ, працавалі над выкананнем намечаных планаў.

Вельмі сімвалічна тое, што сход нашага актыву праходзіць напярэдадні XIX з'езда ВЛКСМ, 60-годдзя піянерскай арганізацыі, у год 60-годдзя ўтварэння СССР. Усе гэтыя падзеі накладваюць асаблівы адбітак на работу ўсіх камсамольскіх арганізацый, у тым ліку і нашай. За прайшоўшы перыяд шмат увагі ўдзялялася шырокай прапагандзе матэрыялаў XXVI з'езда КПСС. Толькі лекцый і дакладаў па матэрыялах з'езда прачытана больш дзвюх тысяч. У перыяд зімовых канікулаў агітбрыгады ўсіх факультэтаў выязджалі з канцэртамі і лекцыямі ў падшэфныя раёны Мінскай вобласці.

На факультэтах праводзіліся сустрэчы з дэлегатамі XXVI з'езда КПСС і XXIX з'езда КПБ.

Традыцыйным ва універсітэце стала сацыялістычнае спаборніцтва «Ніводнага адстаючага побач», на лепшую акадэмічную групу. Па выніках апошніх двух гадоў пераможцамі з'яўляліся IV курс аддзялення палітэканоміі (1980), II курс аддзялення філасофіі (1981). Лепшыя групы заахвочваліся паездкамі за кошт прафкома ў Вільнюс, Ленінград.

Навуковая моладзь універсітэта — адзін з актыўных атрадаў вучоных. Каля 70 працэнтаў друкаваных работ напісана маладымі вучонымі непасрэдна ці ў саавтарстве са старэйшымі калегамі. На рахунку маладых вучоных універсітэта нямала манаграфій.

У апошні час камітэт камсамола універсітэта прыняў шэраг мер па ўмацаванню ідэйнай накіраванасці і павышэнню мастацкага ўзроўню праграмы ў студэнцкім кафэ «Гаўдэамус».

Вялікую ўвагу ўдзяляе камітэт камсамола інтэрнацыянальнаму выхаванню. Паміж камсамольскімі арганізацыямі факультэтаў і зямляцтвамі замежных студэнтаў заключаны дагаворы аб супрацоўніцтве.

Можна было б доўга і шмат гаварыць пра тыя добрыя справы, зробленыя намі, але далёка не ўсё робім мы для паляпшэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, якасці ведаў студэнтаў. Мы павінны ўзнімаць аўтарытэт і студэнта-актывіста. Галоўная мэта студэнта — вучоба, якасць ведаў. Гэта трэба памятаць. Гэта павінна быць зыходным пунктам ва усіх справах камсамольскай арганізацыі. Грамадская работа ва ўсіх яе формах павінна дапамагаць студэнтам вучыцца, а не наадварот. І калі на факультэтах, у групах ёсць актывісты непаспяваючыя або слаба паспяваючыя, іх неабходна вызваліць ад нагрузак ці прыкласці ўсе намаганні, каб дапамагчы ў вучобе. І хаця наш актыў у асноўным моцныя студэнты, мы павінны сказаць сёння — камсамольская работа павінна стаць удзелам выдатнікаў. Тады прэстыж актыву будзе высокім. І пры правядзенні атэстацыі па ГПП не давядзецца камісіі, групе ды і самому камсамольцу адчуваць няёмкасць за свае слабыя адзнакі пры моцных, добрых грамадскіх справах.

Гаворачы аб ГПП, нельга не сказаць аб фармальным падыходзе да складання асабістых планаў. Мы гаворым пра гэта часта і шмат, даём канкрэтныя рэкамендацыі, як гэта выправіць, а выніку пакуль не зусім суцяшальныя. У гэтым годзе ў ходзе ГПА быў выказаны шэраг прапаноў па паляпшэнню яе правядзення. Так, студэнты юрфака прапаноўваюць уключыць у састаў камісіі па ГПП прадстаўнікоў спорткафедры, спортклуба. Шмат спрэчак выклікала спроба камітэта камсамола распаўсюдзіць вопыт механіка-матэматычнага факультэта па правядзенню ГПА без камісіі. Думкі большасці зводзяцца да таго, што прысутнасць камісіі стварае ўрачыстасць, прымушае камсамольца трымаць адказ не толькі перад сваімі калегамі, але і перад старэйшымі таварышамі, ветэранамі партыі і працы, стварае абстаноўку патрабавальнасці. Нягледзячы на станоўчы вопыт, назапашаны ў нас у ходзе ГПА, ёсць цэлы шэраг недахопаў. На некаторых факультэтах былі допушчаны зрывы графікаў, слаба арганізаваны кантроль. Хвароба ўсіх факультэтаў — лаяльнасць пры выстаўленні адзнак па ГПП. Цяпер, калі на факультэтах падводзяцца вынікі ГПП, неабходна дакладна прааналізаваць іх на пасяджэннях камітэта камсамола, зрабіць адпаведныя вывады. Давайце, нарэшце, даб'ёмся, каб камісіі па ГПП бывалі ў групах пастаянна, кантралявалі выкананне асабістых планаў студэнтаў не толькі пры атэстацыі.

У час атэстацыі, асабліва на старэйшых курсах, патрэбна патрабавальна пытацца, ці займаецца студэнт на ФГП, якую другую грамадскую прафесію атрымае ён ва універсітэце? Не сакрэт, з якімі цяжкасцямі мы прыцягваем зараз на ФГП студэнтаў. А ўтрымаць іх там сіл ужо не хапае. Многія спасылаюцца на загружанасць, нецікавасць заняткаў і г. д. Знаёмства з праграмамі, наведванне заняткаў гаворыць аб процілеглым. Заняткі цяпер праходзяць рэгулярна, цікава. У рамках аддзяленняў факультэта практыкуецца правядзенне дыспутаў, сустрэч з цікавымі людзьмі. Іменна тут, дзе ў дыскусіі сутыкаюцца думкі філолагаў і фізікаў, хімікаў і журналістаў, біёлагаў і матэматыкаў, можна ўзаемна ўзбагаціцца.

Мы ганарымся такімі актывістамі, як В. Жук, Т. Сотчанка, П. Аксючыц, А. Войцік, Т. Ляўданская, В. Гафановіч, Я. Памыткін, Д. Буката, В. Смірскі, А. Заграюк, П. Іваноў, А. Астапенка, В. Калмычкова і сотні іншых. З імі можна і ў камсамоле працаваць, і ў бой пайсці. І варта жыць на свеце, калі побач ёсць такія палаючыя сэрцы.

# ПАСТАНОВА

## СХОДУ КАМСАМОЛЬСКАГА АКТЫВУ УНІВЕРСІТЭТА

Заслухаўшы і абмеркаваўшы даклад сакратара камітэта камсамола БДУ імя У. І. Леніна А. Рухлі «Аб ходзе выканання камсамольскай арганізацыяй універсітэта мерапрыемстваў па ажыццяўленню рашэнняў XXVI з'езда КПСС і ўзмацненню выхаваўчай работы з моладдзю», сход камсамольскага актыву адзначае, што камітэтам камсамола універсітэта праводзіцца значная работа ў гэтым напрамку. Пад кіраўніцтвам камітэта камсамола універсітэта камітэты камсамола факультэтаў і іншых падраздзяленняў шмат увагі ўдзяляюць павышэнню якасці ведаў студэнтаў, прыцягненню іх да навукова-даследчай работы, паляпшэнню палітыка-выхаваўчай работы і прыцягненню моладзі да грамадска карыснай працы. Больш чым 300 студэнтаў прынялі ўдзел у навуковых канферэнцыях, прысвечаных 60-годдзю ўтварэння універсітэта. Каманды па фізіцы, біялогіі, правазнаўству занялі першае месца па выніках Усесаюзнай алімпіяды «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс». Да навукова-даследчай работы сталі шырэй прыцягвацца замежныя студэнты, якія навучаюцца ва універсітэце.

Студэнтамі, маладымі выкладчыкамі ва універсітэце за справаздачны перыяд прачытана больш 2 тысяч лекцый і дакладаў па матэрыялах XXVI з'езда КПСС. На механіка-матэматычным, фізічным, юрыдычным факультэтах рэгулярна праводзяцца лекцыі, палітінфармацыі на курсах і ў інтэрнатах. Студэнты філалагічнага факультэта, ФПМ сталі частымі гасцямі ў падшэфных арганізацыях Уздзенскага раёна і г. Мінска. Імі праводзіцца шырокая прапаганда рашэнняў XXVI з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Важнае месца ў іх рабоце належыць прафарыентацыі. Большасць камсамольскіх арганізацый факультэтаў правялі сустрэчы з дэлегатамі XXVI з'езда КПСС. Ва ўсіх камсамольскіх арганізацыях факультэтаў прайшлі камсамольскія сходы з парадкам дня «Твой уклад, камсамолец, у выкананне рашэнняў XXVI з'езда КПСС», на якіх былі прыняты абавязацельствы камсамольскіх груп.

Аглядам грамадска-палітычнай актыўнасці стаў Ленінскі залік «Рашэнні XXVI з'езда КПСС — у жыццё!» Атэставана 9937 камсамольцаў, выдатныя і добрыя ацэнкі атрымалі 8030 студэнтаў.

Неад'емная частка працоўнага выхавання моладзі — студэнцкія будаўнічыя атрады. Месцам дыслакацыі ўдарных спраў студэнцкіх атрадаў універсітэта ў 1981 годзе былі Якуція, Карэлія, Казахстан, Малдавія, Стаўрапольскі край, Беларусь, горад-герой Мінск. У трэцім працоўным семестры 1981 года асвоена 4 млн. 440 тысяч рублёў капіталаўкладанняў. Па выніках рэспубліканскага сацспаборніцтва зводны універсітэцкі атрад заняў першае месца. Сёлета ў саставе Усесаюзнага студэнцкага атрада імя XIX з'езда ВЛКСМ будзе працаваць каля 3 тысяч студэнтаў універсітэта.

У камсамольскіх арганізацыях факультэтаў ёсць шмат цікавых спраў і пачынанняў — на факультэце радыёфізікі і электронікі створаны камуністычны атрад, які змагаецца за прысваенне імя героя цаліны, а ў працоўным семестры 1982 года будзе працаваць на будаўніцтве дзіцячых пляцовак. Камуністычны атрад механіка-матэматычнага факультэта будзе працаваць летам у дзіцячым доме № 2 г. Мінска. На гэтым жа факультэце арганізуецца універсітэт этыкі і эстэтыкі, створаны ўжо 4 клубы. На факультэце прыкладной матэматыкі сканцэнтравана некалькі самадзейных калектываў — агітбрыгада «Фенікс», тэатр мініяцюр і клуб «Красавік». На фізічным факультэце выдатна наладжана шэфская работа.

Разам з тым сход камсамольскага актыву адзначае, што камітэты камсамола факультэта журналістыкі і біялагічнага факультэта не дабіліся дакладнай, мэтанакіраванай сістэмы ў кіраўніцтве камсамольскай арганізацыяй. Назіраецца недастатковая актыўнасць членаў камсамольскіх выбарных органаў факультэтаў, слабая індывідуальная работа з моладдзю, адсутнасць галоснасці рашэнняў камітэтаў камсамола факультэтаў і універсітэта. Не на ўсіх факультэтах камітэт камсамола кантралюе ход выканання асабістых комплексных планаў камсамольцаў, прынятых пастаноў.

Сход камсамольскага актыву БДУ імя У. І. Леніна пастанаўляе:

1. Усю дзейнасць камсамольскай арганізацыі накіраваць на далейшае практычнае ажыццяўленне гістарычных рашэнняў XXVI з'езда КПСС, мерапрыемстваў камітэта камсамола, прынятых на сходзе.

2. Камітэту камсамола універсітэта павысіць адказнасць камсамольскіх арганізацый за якасць ведаў студэнтаў, фарміраваць у кожнага будучага спецыяліста камуністычныя адносіны да вучобы як галоўнага аспекта іх працоўнай дзейнасці. Актыўней разгортваць сацыялістычнае спаборніцтва «Ніводнага адстаючага побач».

3. Шырэй выкарыстоўваць сродкі агітацыйна-масавай і культурна-масавай работы. Абавязаць камітэты камсамола факультэтаў стварыць да канца 1982 года зводныя агітбрыгады. Павысіць узровень лекцыйна-прапагандысцкай работы, якую праводзяць студэнты. На факультэтах, у інтэрнатах аформіць тэматычныя стэнды, прысвечаныя XIX з'езду ВЛКСМ, 60-годдзю ўтварэння СССР, якія адлюстроўваюць ролю студэнцтва ў выкананні рашэнняў XXVI з'езда КПСС.

4. Камітэтам камсамола факультэтаў сканцэнтраваць увагу на якасным паляпшэнні работы ў студэнцкіх інтэрнатах, практыкуючы тут найбольш эфектыўныя формы работы з моладдзю. З гэтай мэтай камітэту камсамола, прафкому універсітэта шырэй разгарнуць агляд-конкурс на лепшы інтэрнат універсітэта. Правесці да канца 1982 года агляд праграм дыскатэк, арганізуемых студсаветамі інтэрнатаў. З мэтай больш эфектыўнай работы па выяўленню і папярэджанню правапарушэнняў сярод моладзі стварыць штаб аператыўных атрадаў у інтэрнатах. Наладзіць работу радыёвузлоў у інтэрнатах. Максімум увагі сканцэнтраваць на інтэрнатах, дзе пражываюць замежныя студэнты.

5. Удасканальваць формы маральна-эстэтычнага выхавання моладзі, фарміравання ў іх багатых духоўных патрэбнасцей. У гэтых мэтах рэкамендаваць камітэтам камсамола факультэтаў у будучым навучальным годзе заключыць дагаворы з тэатрамі горада, наладзіць цесныя сувязі з творчай моладдзю горада. Камітэту камсамола універсітэта шырэй прапагандаваць сярод студэнтаў класічныя музычныя творы, заключыць дагавор з Беларускай дзяржаўнай філармоніяй, арганізаваць на базе філармоніі клуб аматараў класічнай і сучаснай музыкі. Дабіцца творчай работы студэнцкага кафэ «Гаўдэамус». Дапрацаваць праграму і папулярызаваць работу універсітэта этыкі і эстэтыкі, створанага на механіка-матэматычным факультэце. У лістападзе—снежні 1982 года правесці агляд-конкурс мастацкай самадзейнасці факультэтаў, прысвечаны 60-годдзю ўтварэння СССР.

6. Камітэту камсамола універсітэта палепшыць падрыхтоўку камандзіраў і камісараў ССГА. Звярнуць сур'ёзную ўвагу на якасную падрыхтоўку агітбрыгад і лектарскіх груп СБА.

7. Камітэту камсамола універсітэта дабіцца таго, каб кожны факультэт удзельнічаў у правядзенні «зорных» паходаў. У «зорныя» паходы рэкамендаваць лепшых студэнтаў, зацвярджаць іх кандыдатуры на пасяджэннях камітэтаў камсамола факультэтаў.

8. Камітэту камсамола карэнным чынам палепшыць работу прэс-цэнтра, дабівацца галоснасці, аператыўна інфармаваць студэнтаў аб важных падзеях і ініцыятывах у камсамольскіх арганізацыях факультэтаў па распаўсюджанню перадавога вопыту арганізацыйнай і палітыка-выхаваўчай работы, пастаноўкі сацспаборніцтва.

9. Камсамольскім арганізацыям факультэтаў актывізаваць работу «КП», дабівацца стварэння абстаноўкі нецярпімасці вакол фактаў парушэння грамадскага парадку і норм студэнцкага супольнага жыцця.

10. Камітэтам камсамола біялагічнага, хімічнага факультэтаў, факультэта журналістыкі, камсамольскай арганізацыі супрацоўнікаў актывізаваць унутрысаюзную работу. Ва ўсіх камсамольскіх арганізацыях шырэй выкарыстоўваць формы і метады індывідуальнай работы з камсамольцамі, умацоўваць дысцыпліну ў калектывах, прынцыпова і патрабавальна падыходзіць да дзейнасці актывістаў.

11. Камітэту камсамола універсітэта палепшыць работу з камсамольскім актывам, разгарнуць дзейнасць «Школы камсамольскага актыву».

12. Камітэтам камсамола, пярвічным арганізацыям звярнуць асаблівую ўвагу на змест камсамольскіх сходаў, павысіць іх рэзультатыўнасць, выносіць на разгляд пытанні, якія хвалююць калектывы.

13. Камітэту камсамола універсітэта шырэй практыкаваць справаздачы камітэтаў камсамола факультэтаў аб сумеснай рабоце з грамадскімі арганізацыямі, бюро акадэмічных груп, індывідуальныя справаздачы актывістаў і радавых камсамольцаў. Аналізаваць і абагульняць передавы вопыт сумеснай дзейнасці камсамольскіх і іншых грамадскіх арганізацый.

14. У адпаведнасці з пастановай ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ад 11 верасня 1981 года і IX пленума ЦК ВЛКСМ «Аб далейшым уздыме масавасці фізічнай культуры і спорту» камітэту камсамола універсітэта, камітэтам камсамола факультэтаў узяць пад строгі кантроль правядзенне ўсіх масавых фізкультурна-аздараўленчых мерапрыемстваў, прысвечаных знамянальным датам савецкага народа, і спартыўных мерапрыемстваў, якія праводзяцца на факультэце.

# З ДНЁМ ПЕРАМОГІ, ТАВАРЫШЫ!




К. СІМОНОВ

## СЫНОВЬЯМ

**В РАЗЛУКЕ БЫЛИ. СМЕРТЬ ВИДАЛИ.**
**ПРИВЫКЛИ К СКРИПУ КОСТЫЛЕЙ.**
**СВОЙ ДОМ СВОЕЙ РУКОЙ СЖИГАЛИ.**
**В ПОСЛЕДНИЙ ПУТЬ НЕСЛИ ДРУЗЕЙ.**
**ТОГО, С КЕМ ПУТЬ НАШ ЧЕСТНО ПРОЖИТ,**
**СОГНУТЬ ТРУДНЕЕ, ЧЕМ СЛОМАТЬ.**
**ЧЕМ, В САМОМ ДЕЛЕ, ЖИЗНЬ НАС МОЖЕТ,**
**НАС, ВСЕ ВИДАВШИХ, ИСПУГАТЬ!**
**И ЕСЛИ НЕТ ДРУГИХ ПУТЕЙ,**
**МЫ САМИ ВНОВЬ ПОЙДЕМ, В СРАЖЕНЬЯ,**
**НО НАШИХ СУДЕБ ПОВТОРЕНЬЯ,**
**НЕ БУДЕТ В СУДЬБАХ СЫНОВЕЙ!**

# ВЯРТАЕ ПАМЯЦЬ У ТЫЯ ДНІ

НЭЛУ АЛЯКСАНДРАЎНУ я застала ў лабараторыі. Ля яе стала стаялі дзве студэнткі. А яна нешта хутка вылічвала на паперы і ў нечым іх пераконвала. Дзяўчаты глядзелі ў свае сшыткі з формуламі і згодна ківалі.

Нэла Аляксандраўна Полек выкладае аналітычную хімію на хімічным факультэце. Увогуле я такой яе і ўяўляла па расказах студэнтаў і яе калег.

Наталля Чуйкіна, студэнтка II курса:

— Калі ў нас не атрымліваецца нейкая лабараторная работа, Нэла Аляксандраўна робіць яе разам з намі. І потым здзіўляешся — што тут было незразумелага?

Вольга Раманаўна Скараход, прафесар:

— Ведаю Нэлу Аляксандраўну каля пятнаццаці гадоў. Гэта вельмі добрасумленны работнік. Любіць сваю справу і таму лёгка знаходзіць мову і з калегамі, і са студэнтамі.

Але, як сказала пяцікурсніца Марыя Крапасевіч, што рыхтуе дыпломную работу пад кіраўніцтвам Нэлы Аляксандраўны, вельмі мала ведаем мы аб сваіх выкладчыках. З цікавасцю слухаюць нашу размову дзяўчаты, што займаюцца ў лабараторыі. Не кожная ведае, што Нэла Аляксандраўна — удзельніца вайны. Што, будучы такой, як мы зараз, яна змагалася супраць захопнікаў спачатку ў падполлі, а потым разам з партызанамі.

...Вясною 1942 года ў Калодзішчах, дзе апынулася Нэла са сваёй маці і малодшай сястрой, была створана падпольная група. Арганізатарам яе была Марыя Федасееўна Малаковіч. Спачатку гэта была толькі група, якая існавала сама па сабе, без якіх-небудзь сувязей, і складалася ў асноўным толькі з моладзі. Але пазней, дзякуючы Малаковіч, наладзілася сувязь з партызанскімі атрадамі брыгады «За Савецкую Беларусь!», а потым і з Мінскам.

Нэла і яе чатырнаццацігадовая сястра былі аднымі з першых членаў арганізацыі. Маці, вопытны ўрач, дапамагала таксама.

Заданні, якія выконвала група, былі самыя разнастайныя. Нэла Аляксандраўна ўспамінае аб наладжванні кантактаў з савецкімі ваеннапалоннымі, якія імкнуліся знайсці сувязь з партызанамі. У гэтым дапамагала ім падпольная група. Яе члены арганізоўвалі ўцёкі з палону. Адводзіла вызваленых у лес Нэла разам з сяброўкай Валянцінай Кутузавай. Безумоўна, аперацыя была вельмі рызыкоўная. За яе Нэла Аляксандраўна была ўзнагароджана сваім першым медалём — «Партызану Айчыннай вайны».

— А вам не страшна было? — не вытрымлівае адна студэнтка. — Вось, думаю, ці змагла б я так?

— Страшна. Канешне, страшна. Але другога шляху тады не было. І ты б змагла, як змаглі многія ў тыя гады. Проста, жывучы ў звычайных умовах, чалавек не ведае сваіх уласных магчымасцей. Праяўляюцца яны часцей за ўсё ў экстрэмальных умовах...

Як зараз памятае Нэла Аляксандраўна той дзень, у які ёй прыйшлося зведаць самы жудасны страх.

— Я ішла з Калодзішчаў у Мінск на сустрэчу з сувязной. Мароз. Сонца... Калі выйшла з лесу на дарогу, то ў мяне сціснулася сэрца ад таго, што ўбачыла. Па баках дарогі праз пэўны прамежак стаялі вісельні. І да кожнага з павешаных прымацавана была шыльда: «Я партызан. Я забіў многа нямецкіх салдат». Цяжка расказаць, што перажыла я...

Мы ціха слухаем Нэлу Аляксандраўну. Стараемся ўявіць яе ў тую ваенную пару. І кожная па-свойму бачыць у гэтай простай, сціплай жанчыне маладую смелую падпольшчыцу.

А Нэла Аляксандраўна зноў і зноў, ужо ў каторы раз у сваім жыцці, вяртаецца ў тыя дні...

Падпольная арганізацыя жыла і дзейнічала. Расла. І немцам усе часцей прыходзілася адчуваць яе існаванне. Урэшце фашыстам удалося выйсці на след арганізацыі. Пачаліся арышты. Многія падпольшчыкі тады апынуліся ў турмах. Некаторым удалося перайсці ў партызанскі атрад. Сярод іх была і Нэла са сваімі роднымі.

Спачатку Нэлу Аляксандраўну залічылі ў роту падрыўнікоў, затым яна стала медсястрой. А калі наладзілася сувязь з Вялікай зямлёй, працавала пры штабе. Вакол былі ўсе свае, савецкія. Не было адчування, што ўвесь час жывеш пад мечам і што ў любы момант у хату могуць уварвацца салдаты і арыштаваць. Не трэба было хадзіць, азіраючыся...

Самым большым святам быў прыход Чырвонай Арміі. Нарэшце дачакаліся таго ліпеня Нэла, яе маці, сястра, партызаны атрада імя Лазо, усе беларусы. Таго ліпеня, калі па мінскіх вуліцах, заваленых цэглай, па вуліцах, паветра якіх было яшчэ гарачым ад бою, праехалі савецкія танкі.

Жыццё пайшло сваім звычайным ходам. На месцы спаленых вёсак паяўляліся новыя. Замест разбураных гарадскіх вуліц выпростваліся праспекты. Рабочыя вярталіся на заводы. Студэнты запаўнялі аўдыторыі тэхнікумаў і інстытутаў.

Нэла Аляксандраўна паступае ва універсітэт на хімічны факультэт. У 1949 годзе яна атрымала дыплом. Потым — абарона кандыдацкай дысертацыі.

— Ніколі не думала, што буду выкладчыцай. Але так распарадзіўся лёс. І аб гэтым я ніколькі не шкадую.

...Звычайная жанчына. Нічога гераічнага ў яе абліччы. Як і ўсе жанчыны, кожны дзень яна спяшаецца дамоў, клапоціцца аб сям'і, нянчыць унукаў. Аднак жа знайшла яна ў 17 гадоў сілы, мужнасць змагацца з ворагам. І не бачыла для сябе другога шляху...

Такая яна, Нэла Аляксандраўна Полек, выкладчыца хімічнага факультэта, ветэран Вялікай Айчыннай.

**С. ВЯРОХА,**
**студэнтка журфака.**

ІШОЎ ЧАЦВЁРТЫ, апошні год вайны. І чым бліжэй была перамога, тым цяжэйшымі станавіліся баі. Раз'юшаны вораг з рашучасцю асуджанага адстойваў кожны населены пункт, кожны дом, кожную вышыню.

...Іменна ў гэты час — ранняй вясной 1945-га — артылерыйскаму палку, якім камандаваў падпалкоўнік Ягор Андрэевіч Піскуноў, было даручана разам з іншымі вайсковымі падраздзяленнямі фарсіраваць Одэр. Полк паспяхова пераправіўся на левы бераг, захапіў плацдарм і, чакаючы падыходу пяхоты, заняў абарону. Аднак пехацінцам пераправіцца не ўдалося. Становішча палка стала надзвычай складаным: наперадзе — вораг, ззаду — рака.

# Праз горан Вялікай Айчыннай

Патрэбна была вялікая мужнасць, каб змагацца ў такіх умовах. Патрэбна была не меншая мужнасць, каб выстаяць, перамагчы. І людзі выстаялі.

Калі скончыліся снарады, батарэйцы лейтэнанта Пагарэлава захапілі некалькі варожых танкаў і з іх вялі агонь па праціўніку; сувязіст сяржант Дэмурчак, забяспечваючы сувязь, праз сябе прапусціў ток пашкоджанай лініі; старшына 1-й батарэі Кузняцоў, рызыкуючы жыццём, пад агнём ворага праз Одэр пераправіў для палка боепрыпасы.

...Праз дзень на плацдарм высадзілася падмацаванне. Байцы і камандаванне палка за праяўленыя мужнасць і гераізм былі ўдастоены высокіх урадавых узнагарод. Камандзір палка Я. А. Піскуноў быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

Гэта толькі адзін эпізод з баявога шляху Ягора Андрэевіча. А быў ён вельмі доўгім і цяжкім: Курск і Львоў, Беласток і Кракаў, Кіеў і Катавіцы...

Перамогу палкоўнік Піскуноў сустрэў у Празе. На грудзях яго ў Дзень Перамогі побач з іншымі ўрадавымі ўзнагародамі ззялі ордэн Айчыннай вайны першай ступені, два ордэны Чырвонага Сцяга, тры ордэны Чырвонай Зоркі.

Пасля вайны Ягор Андрэевіч Піскуноў застаўся верным вайсковай службе — закончыў ваенную акадэмію, працаваў на ваенна-дыпламатычнай рабоце. Потым, аднак, сказаліся колішнія раненні — вымушаны быў змяніць работу. Працаваў спачатку на ваеннай кафедры БДУ, а цяпер, вось ужо больш 20 гадоў ён — памочнік дэкана фізічнага факультэта.

Багаты вопыт, франтавая загартоўка дапамагаюць яму выхоўваць моладзь. І не дарэмна Ягор Андрэевіч карыстаецца вялікай павагай сярод студэнтаў як умелы кіраўнік, вопытны дарадчык і, безумоўна, як ветэран вайны — чалавек, якому мы абавязаны сённяшнім мірным днём.

**В. ЖДАНКО,**
**член прэс-цэнтра прафкома.**

# ШТОДЗЁННЫ ПОДЗВІГ

НА МАЕ ПЫТАННЕ, ці магу бачыць Надзею Вікенцьеўну Зюбу, мне паказалі столік, за якім сядзела немаладая жанчына. «У яе павінен быць ціхі прыемны голас», — рашыла я. Так і атрымалася. Кожнае яе слова ўліваецца ў душу, прымушае разам з Надзеяй Вікенцьеўнай перажыць хвалянне ўспамінаў, горыч страты баявых сяброў.

...Заканчваўся першы ваенны тыдзень. У пасёлак Тычынкі, што ля Узды, прыехалі на матацыклах немцы. Іх нахабныя твары расплываліся ад задавальнення. А мясцовыя жыхары ўспаміналі нашых адступаўшых байцоў з патрэсканымі ад смагі вуснамі, крывавымі павязкамі. Байцы горача абяцалі вярнуцца і адпомсціць за ўсё. Рукі самі сціскаліся ў кулакі...

Надзея Вікенцьеўна ўспамінае, што спачатку ніхто іх, моладзь, не арганізоўваў збіраць зброю, шкодзіць ворагу пры малейшай магчымасці. Самі здагадваліся. Пасля даведаліся аб існаванні падпольнага Узденскага райкома партыі, і пад яго кіраўніцтвам падпольная група пасёлка актыўна ўключылася ў барацьбу. Звязаліся з партызанамі. Надзея Вікенцьенуа выконвала абавязкі сувязной.

— Надзея Вікенцьеўна, ці думалі вы тады, што ўсё, што вы робіце, — подзвіг?

— Канешне, не. Ішлі ў разведку ў стан ворага, бо трэба было ісці. Інакш не ўяўлялі сваё жыццё. Пакуль вораг таптаў родную зямлю — мы змагаліся. Вера ў перамогу, у дабро — вось тое, што натхняла нас на барацьбу, прымушала ісці на рызыку і днём, і ўначы, каб выканаць атрыманы загад.

Праўда, аднойчы мне было вельмі страшна. Цяпер ужо цяжка ўстанавіць, чаму ў нашай падпольнай арганізацыі пачаліся арышты. Прыйшлі фашысты і па мяне. Я схавалася ў суседзяў. Не адшукаўшы мяне, немцы рашылі праверыць заадно і суседзяў. Здавалася, стук сэрца чуваць на ўсю ваколіцу. Але немцы пайшлі ні з чым. Заставацца ў падполлі не было ўжо ніякага сэнсу. Я пайшла ў лес, да партызан...

За ўдзел у партызанскім руху Надзея Вікенцьеўна пасля вайны была ўзнагароджана медалём «Партызану Вялікай Айчыннай вайны II ступені».

Гады, вайна, партызанскае жыццё даюць аб сабе ведаць. Раней і нервы, здаецца, былі мацнейшымі. А зараз часцей пачало сніцца ваеннае ліхалецце. Так ужо здараецца, што, пражыўшы значную частку жыцця, чалавек пачынае ўглядацца ў мінулае, са сваёй, сённяшняй меркай падыходзіць да зробленага...

Зараз Надзея Вікенцьеўна Зюба працуе метадыстам на завочным факультэце. Універсітэту аддадзена дваццаць пяць гадоў.

**Р. МАРЧУК,**
**старшыня прэс-цэнтра прафкома.**

ДА 70-ГОДДЗЯ З ДНЯ ВЫХАДУ ПЕРШАГА НУМАРА ГАЗЕТЫ «ПРАВДА»

# ЯНКА КУПАЛА І ЯКУБ КОЛАС НА СТАРОНКАХ «ПРАВДЫ»

ДА 100-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Я. КУПАЛЫ І Я. КОЛАСА

*Селетні год — год знамянальных дат. Яшчэ да таго, як мы ўсенародна будзем святкаваць шэсцьдзесят пятую гадавіну Вялікага Кастрычніка і шасцідзесяціголддзе ўтварэння СССР, у нашай краіне, а па рашэнню ЮНЕСКА — і ва ўсім свеце, будзе шырока адзначацца стогадовы юбілей Янкі Купалы (7 ліпеня) і Якуба Коласа (3 лістапада). Да ўсіх гэтых дат хораша далучаецца яшчэ адна — сямідзесяціголддзе з дня заснавання цэнтральнага друкаванага органа КПСС газеты «Правда».*

*«Правда» адыграла вялікую ролю ў жыццёвым і творчым лёсе Янкі Купалы і Якуба Коласа, у папулярызацыі і літаратурна-крытычным асэнсаванні іх творчасці. Вершы, публіцыстычныя выступленні Купалы і Коласа на старонках вядучай партыйнай газеты адносяцца да яе лепшых публікацый, з'яўляюцца акрасай яе літаратурных куткоў і старонак.*

*Творчыя кантакты народных песняроў Беларусі з «Правдой» зацікавілі маладых навукоўцаў — членаў гуртка гісторыі і тэорыі беларускай літаратуры філалагічнага факультэта Вікторыю Каўхуту і Сяргея Кавалёва. З дакладамі на гэтую тэму яны выступілі на нядаўняй студэнцкай навуковай канферэнцыі (дарэчы, абодва даклады адзначаны дыпломамі). Думаю, што з некаторымі вынікамі навуковых пошукаў маладых літаратуразнаўцаў будзе цікава пазнаёміцца і чытачам «Беларускага універсітэта».*

*В. РАГОЙША,*
*дацэнт кафедры беларускай літаратуры.*

## Эпоха, набраная шрыфтам

У той год, калі паявіўся першы нумар «Правды», Якубу Коласу споўнілася трыццаць. Сёлета разам са стагоддзем народнага паэта Беларусі мы адзначаем і 70-годдзе з дня заснавання цэнтральнага друкаванага органа Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

Акрамя простага супадзення дат, ёсць тут сувязь непасрэдная: на старонках газеты неаднаразова паяўляліся вершы Коласа, яго публіцыстычныя выступленні, а таксама артыкулы пра творчы шлях самога пісьменніка, звесткі пра яго грамадскую дзейнасць.

Няма ніякага сумнення, што праўдаўскія матэрыялы Коласа маюць вялікае значэнне. Па-першае, гэта важна ў дачыненні да творчай біяграфіі народнага паэта. Па-другое, яны цікавыя іменна сваёй газетнай спецыфікай — спецыфікай «Правды» як галоўнай савецкай газеты, як цэнтральнага друкаванага органа партыі.

Артыкул «Паэма нашай эпохі», змешчаны ў газеце 1 лютага 1935 года пад рубрыкай «Нататкі дэлегата» і напісаны дэлегатам VII Усесаюзнага з'езда Саветаў Якубам Коласам — першае выступленне беларускага песняра на старонках «Правды». Апошні па часе матэрыял пра Коласа ў гэтай газеце — «Падарожжа ў свет паэта» Максіма Лужаніна, змешчаны да 90-годдзя з дня нараджэння народнага паэта Беларусі. Інтэрвал у часе паміж публікацыямі — 37 гадоў. За гэты час «Правда» надрукавала восем вершаў паэта, восем яго выступленняў і артыкулаў, дзевяць артыкулаў пра творчасць і жыццё Коласа. На першы погляд не так і шмат. Але ж любая публікацыя ў «Правде» — гэта для кожнага пісьменніка аўтарытэтнае пацвярджэнне значнасці яго таленту. І атрымаць такое пацвярджэнне надзвычай ганарова.

Сярод матэрыялаў пра Якуба Коласа вылучаюцца артыкул П. Броўкі, прысвечаны «Рыбаковай хаце», і артыкул Я. Мазалькова пра трылогію «На ростанях». Вылучаюцца яны сваёй арыгінальнасцю, глыбінёй аналізу канкрэтных твораў.

Апублікаваныя ў «Правде» вершы і артыкулы народнага паэта Беларусі, а таксама артыкулы пра паэта заслугоўваюць нашай пільнай увагі. Па-першае, яны коласаўскія і праўдаўскія адначасова. Па-другое, гэта матэрыялы пра час, пра цэлую эпоху ў жыцці савецкага народа. А па-трэцяе, яны — пра Беларусь, пра беларускую культуру і беларускі народ, пра еднасць Краіны Саветаў.

**С. КАВАЛЁЎ,**
**студэнт II курса філфака.**

## КАЛЯНДАР ПРЫРОДЫ



**«Зелень нивы, рощи лепет,**
**В небе жаворонка трепет,**
**Теплый дождь, сверканье вод, —**
**Вас назвавши, что прибавить?**
**Чем иным тебя прославить,**
**Жизнь души, весны приход!»**

Ці ты гэта, май-чараўнік?! Ці твой кліч прыцягвае ўсіх на вуліцы, у лясы? Ці ты ўсыпаў лясныя прагаліны лазурнымі позіркамі падснежнікаў? Прыходзіш ты і... Прылятаюць птушкі. Мацней пачынаюць біцца нашы сэрцы, іскрацца любоўю і шчасцем вочы. Квітнее чаромха...

Знікла пад маладой травой мінулагодняе лісце. Набіраюць моц набраклыя бутоны пярэсны. Вось-вось распусціць яна свае залацістыя шары. Усё часцей і часцей можна ўбачыць матылёў. Зацвіла медуніца.

Ну што ж! Час за грыбамі-падснежнікамі! Вясна ў нашых шыротах не лічыцца грыбным сезонам. Аднак... ужо паявіліся смаржкі.

На палях поўнай хадою ідзе пасяўная кампанія. Зараз нельга прагадаць. Спознішся — не пасееш, не пасееш — не пажнеш.

**А. ВАЛОШЫН,**
слухач падрыхтоўчага аддзялення.

**На здымку:** веснавыя клопаты.

Фотаэцюд **В. Шачака.**

## ПЛЁН СУПРАЦОЎНІЦТВА

«ГОЛАС «ПРАВДЫ», — пісаў Янка Купала, — гэта голас нашай вялікай партыі, голас сапраўднай жыццёвай праўды. І таму з такой увагай сачу я за кожным словам любімай газеты». Народны паэт Беларусі цаніў вялікую ролю «Правды» ва ўмацаванні творчай садружнасці народаў Савецкай краіны. З удзячнасцю зазначаў ён, што дзякуючы «Правде» лепшыя творы пісьменнікаў сталі вядомымі для чытачоў усіх народаў Савецкага Саюза.

Увага газеты «Правды» да развіцця нацыянальных літаратур абумоўлена самім статусам друкаванага органа Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, які заклікаиы паслядоўна праводзіць у жыццё ленінскую нацыянальную палітыку. І газета заўсёды была на вышыні гэтай ганаровай задачы.

Заўсёды з зацікаўленасцю і клопатам ставілася «Правда» да творчасці Янкі Купалы, Якуба Коласа, Міхася Лынькова і іншых вядомых беларускіх савецкіх пісьменнікаў. У гэтым праявілася павага да беларускай літаратуры, да ўсяго беларускага народа.

Першыя публікацыі пра Я. Купалу паявіліся ў «Правде» яшчэ ў 20-я гады і насілі інфармацыйны характар. У 1927 годзе Купала ўдзельнічаў у рабоце VIII Усебеларускага з'езда Саветаў. Пра гэта адразу паведаміла сваім чытачам газета «Правда» ў нумары за 14 красавіка. У студзені 1929 года ў газеце гаварылася пра адкрыццё Акадэміі навук Беларусі, пра выбранне правадзейнымі членамі АН БССР Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Асабліва шмат публікацый Я. Купалы і пра Я. Купалу прыпадае на 30-я гады, калі творчасць нашага песняра набыла асаблівую маштабнасць, а тэма ўслаўлення Савецкай Беларусі арганічна злілася ў паэзіі Я. Купалы з ідэяй савецкай дзяржаўнасці, садружнасці сацыялістычных нацый. Паэзія беларускага песняра была сугучнай жыццю Савецкай краіны і таму мела вялікае значэнне для ўсесаюзнага чытача. Невыпадкова ў 30-я гады «Правда» змясціла аж дваццаць шэсць вершаў Я. Купалы, у тым ліку амаль усе творы славутага Ляўкоўскага цыкла, якія ўдала пераклалі М. Ісакоўскі, М. Галодны, С. Гарадзецкі.

Значнай і хвалюючай падзеяй грамадскага і літаратурнага жыцця Савецкай краіны 30-х гадоў з'явілася адкрыццё першага Усесаюзнага з'езда савецкіх пісьменнікаў. Семнаццатага жніўня ў «Правде» быў змешчаны артыкул Я. Купалы «Магутная сіла», у якім народны паэт Беларусі вітаў з'езд, назваўшы яго вялікім святам народа. «І на гэтым свяце,—адзначаў пясняр,—асабліва шчаслівыя мы, пісьменнікі раней непісьменных, адсталых ускраін Расіі». Я. Купала выказаў гонар за ўсю шматнацыянальную савецкую літаратуру. Ён падкрэсліў, што ў Савецкім Саюзе створаны ўсе ўмовы для палёту творчай думкі чалавека, для развіцця навукі і культуры. Гаварыў Я. Купала і пра галоўны абавязак савецкага пісьменніка — мацаваць вялікі Савецкі Саюз.

Першаму з'езду пісьменнікаў Я. Купала прысвяціў свой вядомы верш «Трэба нам песень!» Яго ён прачытаў з трыбуны з'езда пісьменнікаў. 24 жніўня 1934 года гэты верш пад назвай «Песни нужны нам!» у перакладзе С. Гарадзецкага надрукавала «Правда». Перакладчык удала перадаў змест і асаблівасці рытма-мелодыі купалаўскага верша, у якім беларускі паэт заклікаў савецкіх пісьменнікаў ствараць песні, вартыя вялікай эпохі.

Пасля першага Усесаюзнага з'езда савецкіх пісьменнікаў «Правда» палічыла неабходным бліжэй пазнаёміць сваіх чытачоў з літаратурай народаў СССР. З гэтай мэтай у газеце пачала друкавацца серыя артыкулаў пра нацыянальных пісьменнікаў краіны. Першы з іх быў прысвечаны Я. Купалу. Аўтар яго даў кароткую біяграфію беларускага паэта, пераканаўча сказаў пра «незвычайны сацыяльны аптымізм» песняра. Высока былі ацэнены крытыкам творы Я. Купалы савецкага часу — вершы, паэма «Над ракой Арэсай». У артыкуле адзначалася, што чытачы Савецкай краіны з нецярпеннем чакаюць выхаду ў свет выбраных твораў Я. Купалы на рускай мове.

Грунтоўны разгляд творчасці Я. Купалы зрабіў на старонках «Правды» А. Суркоў у артыкуле «Народны паэт» (8 снежня 1940 года), прысвечаным 30-годдзю літаратурнай дзейнасці беларускага песняра. Тут адзначаліся заслугі паэта, які «песенным ладам сваіх вершаў выказаў душу роднага народа». А. Суркоў пісаў пра багацце рытмаў і інтанацый, пра «натуральнасць і прастату вобразаў, параўнанняў, сюжэтаў» Я. Купалы.

П. Броўка назваў Я. Купалу адной з самых высокіх і яркіх вяршынь беларускай літаратуры, «адным з самых пранікнёных песняроў дружбы народаў нашай краіны». Гэта пацвярджаюць і публіцыстычныя творы Я. Купалы, многія з якіх таксама друкаваліся на старонках «Правды». 20 чэрвеня 1936 года паэт змясціў у газеце артыкул «Памяці вялікага чалавека», у якім выказаў свой глыбокі смутак і смутак усёй Беларусі з прычыны смерці М. Горкага.

Ужо ў самым пачатку Вялікай Айчыннай вайны, 18 ліпеня 1941 года, «Правда» надрукавала артыкул Я. Купалы «Германскі фашызм — злейшы вораг беларускага народа». 18 жніўня 1941 года ў «Правде» быў змешчаны тэкст прамовы Я. Купалы на Усеславянскім мітынгу — «Вышэй сцяг барацьбы за свабоду і незалежнасць!»

Газета «Правда» адыграла значную ролю ў папулярызацыі творчасці Я. Купалы сярод шматнацыянальнага савецкага чытача, чытачоў замежных краін. Газета ўнесла і ўносіць значны ўклад у даследаванне творчасці Я. Купалы, крытычную інтэрпрэтацыю яго паэтычнай спадчыны.

Праз рускія пераклады, якія рэгулярна змяшчаліся і змяшчаюцца на старонках «Правды», купалаўская паэзія даходзіць у самыя аддаленыя куткі зямнога шара.

**В. КАЎХУТА,**
**студэнтка II курса філфака.**


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

6 мая 1982 г.

АТ 21256 Заказ 906

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14. ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ